Сяргей ЕЛІЗАРАЎ

# Выбары ў мясцовыя Саветы БССР 1931—1934 гг.: ад "абвастрэння класавай барацьбы" да "агляду перамог сацыялістычнага будаўніцтва"

*Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. азначала карэнны пералом у лёсе ўсіх народаў былой Расійскай Імперыі. Мяняліся сутнасныя асновы жыццядзейнасці грамадства ў палітычнай, эканамічнай, культурнай сферах, менталітэту, маральных і ідэалагічных арыенціраў. Адным з прыярытэтаў бальшавіцкага кіраўніцтва з'яўлялася стварэнне сістэмы органаў дзяржаўнай улады і кіравання на аснове новага, савецкага тыпу дэмакратыі, які падаваўся як праява сапраўднага народаўладдзя, што рэалізуецца з дапамогай прамога ўдзелу працоўных мас у кіраванні дзяржавай. Патрэбна было пераўтварыць гэтую тэарэтычную мадэль дзяржаўнага ладу ў канкрэтныя формы, улічваючы гістарычныя абставіны, ступень падтрымкі новай улады насельніцтвам і гатоўнасці членаў бальшавіцкай партыі кіраваць на месцах. Арганізацыйнай формай такога народаўладдзя станавіліся Саветы рабочых, чырвонаармейскіх і сялянскіх дэпутатаў як класавыя арганізацыі працоўнага народа, што і атрымала замацаванне ва ўсіх савецкіх Канстытуцыях (як саюзных, так і рэспубліканскіх).*

Аднак стыхія прамога народаўладдзя несла значныя пагрозы дамінаванню бальшавікоў у сістэме гэтых Саветаў. Досыць хутка партыйная эліта зразумела, што рэальная ўлада павінна належаць не самім Саветам, а іх выканаўчым і распарадчым органам, праз якія і мусяць на самай справе ажыццяўляцца ўсе задуманыя імі мерапрыемствы. Паўстала неабходнасць стварыць такую сістэму выбараў, якая дазволіла б, з аднаго боку, сцвярджаць аб рэальнай уладзе працоўных, а з другога — забяспечыць патрэбны кіруючай партыі склад выканкамаў Саветаў. У выніку быў распрацаваны выбарчы механізм, які прадугледжваў прамыя выбары толькі на ўзроўні нізавых звёнаў органаў дзяржаўнай улады і ўскосныя (шматступенныя) — на ўсіх наступных.

Мясцовыя Саветы з самага пачатку ствараліся не як органы самакіравання, а як неад'емная частка агульнай і адзінай савецкай сістэмы дзяржаўнай улады і кіравання. Такім спосабам бальшавікі вырашалі пытанні каардынацыі дзейнасці цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання, узгаднення рэгіянальных (лакальных) і агульнадзяржаўных інтарэсаў. Гэтыя пытанні заўсёды востра стаяць пры суіснаванні двух відаў публічнай улады — дзяржаўнай і мясцовага самакіравання, з уласцівым такой сістэме прынцыпам аддзялення мясцовага самакіравання ад дзяржаўнай улады, надання самакіраванню значнай самастойнасці і аўтаномнасці. Уключэнне ж тэрытарыяльных органаў у агульную вертыкаль улады, пабудаваную на аснове жорсткага падпарадкавання ніжэйшых структураў вышэйстаячым, фактычна гэтую праблему здымала.

На месцах сістэма органаў дзяржаўнай улады і кіравання традыцыйна будавалася ў адпаведнасці з



***ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч.***

*Прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. У 2013 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)". Аўтар больш за 180 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку манаграфій "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009), "Становление и развитие системы местных Советов БССР в 1919—1929 годах" (Гомель, 2016).*

існуючым адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем як знешняй формай арганізацыі і ўстанаўлення прасторавых межаў кампетэнцый мясцовых Саветаў, а таксама спосабам размеркавання па вертыкалі іх правоў, абавязкаў, дзяржаўных матэрыяльна-фінансавых рэсурсаў. З 1924 г. у выніку адміністрацыйна-гаспадарчай рэформы БССР дзялілася на сельсаветы, раёны і акругі. Ніжэйшае звяно адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення складалі сельсаветы, мястэчкі і гарады (акруговыя і неакруговыя). Адпаведна вышэйшымі органамі ўлады тут абвяшчаліся сельскія, местачковыя і гарадскія Саветы, якія абіраліся наўпрост насельніцтвам. Адначасова праходзілі выбары і дэлегатаў на раённыя з'езды Саветаў. На гэтых з'ездах абіраліся раённыя органы ўлады і дэлегаты на акруговы з'езд, на акруговых — акруговыя органы і дэлегаты на Усебеларускі з'езд Саветаў. Гарадскія Саветы нэпасрэдна пасылалі сваіх прадстаўнікоў на раённыя і акруговыя з'езды Саветаў. Пасля ліквідацыі ў ліпені 1930 г. акругаў у БССР выбары дэлегатаў на Усебеларускі з'езд Саветаў сталі праводзіцца на раённых з'ездах Саветаў, а таксама Мінскім, Віцебскім і Гомельскім гарадскімі Саветамі.

Пры арганізацыі і правядзенні выбараў ужываўся вытворча-тэрытарыяльны прынцып: дэпутаты нізавых Саветаў абіраліся пераважна па прадпрыемствах (у сельсаветы — у калгасах і саўгасах), ва ўстановах і грамадскіх арганізацыях, астатняя "неарганізаваная" частка насельніцтва ўдзельнічала ў выбарах па месцы жыхарства.

У гэтай выбарчай сістэме адзінай рэальнай магчымасцю насельніцтва непасрэдна аказаць уплыў на фарміраванне ўсёй вертыкалі дзяржаўнай улады і кіравання былі выбары ў нізавыя Саветы — сельскія, местачковыя і гарадскія. Таму і партыйна-савецкія ўладныя структуры сваю ўвагу канцэнтравалі менавіта на гэтай стадыі выбарчай кампаніі.

Частковыя перавыбары ў мясцовыя Саветы пачатку 1930 г. дазволілі завяршыць працэс ператварэння сельсаветаў у органы "дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы". Сельсаветы канчаткова сталі апаратам, які прадстаўляў інтарэсы найбяднейшай часткі сялянства і легітымізаваў усе мерапрыемствы партыйна-савецкага кіраўніцтва на месцах[1].

Новыя перавыбары павінны былі замацаваць гэты вынік. І сама ідэалогія, і канкрэтны механізм чарговай выбарчай кампаніі, якая праводзілася ў снежні 1930 г. — лютым 1931 г. (далей — перавыбарчая кампанія 1931 г.), змен не зведалі. Выбары праводзіліся па інструкцыі аб выбарах у Саветы, зацверджанай ЦВК СССР 3 кастрычніка 1930 г. і адпаведнай беларускай інструкцыі Прэзідыума ЦВК БССР ад 15 лістапада 1930 г.[2]. Ужо ў саміх гэтых дакументах савецкія органы ўлады і кіравання, прафсаюзы і грамадскія арганізацыі арыентаваліся на неабходнасць у чарговы раз ператварыць перавыбары ў месца *"класавай барацьбы, што пастаянна абвастраецца"*.

Для партыйна-савецкага кіраўніцтва па-ранейшаму важнай заставалася задача мабілізацыі традыцыйных "пралетарскіх" слаёў вёскі — беднякоў і батракоў. 21 лістапада 1930 г. Сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне "Аб правядзенні раённых канферэнцый батрацка-бядняцкіх груп". Такія канферэнцыі павінны былі *"стварыць неабходны пералом"* у рабоце з беднатой, па-ранейшаму ў сваёй масе пасіўнай. Калгаснікі яшчэ не разглядаліся ўладай як самастойная сіла, здольная забяспечыць неабходны вынік выбараў. У сувязі з гэтым іх прапаноўвалася далучаць да працы бядняцка-батрацкіх груп, у тым ліку і да ўдзелу ў раённых бядняцка-батрацкіх канферэнцыях[3].

29 лістапада 1930 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову "Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі Саветаў" (з пазнакай "не для друку"), у якой упершыню была пастаўлена задача стопрацэнтнага ("пагалоўнага") удзелу ў выбарах усіх рабочых. Як і раней, кандыдатуры ў члены Саветаў, падрыхтаваныя партыйна-савецкай вертыкаллю, прадпісвалася абмеркаваць на сельскіх і раённых нарадах беднаты і батрацтва. Зноў асабліва падкрэслівалася неабходнасць ачышчэння Саветаў ад *"няўстойлівых апартуністычных і класава варожых элементаў"*. Прапаноўвалася надаць шырокі размах і новаму сродку перадвыбарчай агітацыі і мабілізацыі "пралетарскіх слаёў" — распаўсюджванню ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва, розных конкурсаў, аглядаў Саветаў, брыгад і г. д.[4].

Пералік мерапрыемстваў у перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў у асноўным быў традыцыйны і галоўным чынам уключаў у сябе арганізацыю розных нарад і сходаў груп беднаты, калгаснікаў, дэлегацкіх сходаў жанчын, моладзі, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан, савецкага прафесійнага актыву, выданне метадычных матэрыялаў і ведамасных інструкцый.

Новай формай агітацыі і папулярызацыі выбарчай кампаніі стала "перадвыбарчая эстафета", што пачалася ў Ельскім раёне БССР па ініцыятыве рэдакцыі газеты "Савецкая Беларусь". Яна праводзілася для актывізацыі мясцовага савецкага актыву і забеспячэння максімальнай яўкі на выбары. Усяго ў ёй ўдзельнічаў 41 раён, у якіх праводзілася праверка работы Саветаў і асобных дэпутатаў адмысловымі брыгадамі (было задзейнічана больш за 1,5 тысяч чалавек)[5]. Гэтая форма паказала сваю эфектыўнасць: калі ў сярэднім па БССР у выбарах узялі ўдзел 63,3% выбаршчыкаў, то ў большасці раёнаў, уключаных ў "перадвыбарчую эстафету", — ад 67 да 80%[6].

Планавалася цесна звязаць справаздачна-перавыбарчую кампанію з рашэннем задач масавай калектывізацыі. За гэты час было арганізавана 690 новых калгасаў, у калгасы ўступіла 11 300 сялянскіх гаспадарак. Аднак заява рэспубліканскага партыйна-савецкага кіраўніцтва аб *"значным ўздыме хвалі калектывізацыі"* маскіравала фактычны зрыў гэтай кампаніі: у выніку ўсіх гэтых дзеянняў за перыяд падрыхтоўкі да выбараў колькасць калектывізаваных двароў павялічылася толькі на 2,5%[7].

У БССР (як і ў цэлым па СССР) на перавыбарах 1931 г. скарацілася колькасць асоб, пазбаўленых вы-

барчага права: па СССР — з 4,9% (у 1929 г.) да 3,9% (у 1931 г.), у БССР — адпаведна з 2,39% да 2,16% (у абсалютных лічбах па БССР — з 78 519 да 62 290 чалавек). Але гэтае скарачэнне галоўным чынам было дасягнута за кошт гарадскіх жыхароў. У сельскай жа мясцовасці, наадварот, працэнт "лішэнцаў" узрос з 1,9 да 2,0 (у абсалютных лічбах — з 37 842 да 41 085 чалавек). У выніку распачатай масавай калектывізацыі і "барацьбы з кулацтвам" значна вырасла колькасць асоб, пазбаўленых выбарчага права за выкарыстанне наёмнай працы з мэтай атрымання прыбытку (з 3497 да 8813 чалавек) і як членаў сем'яў "лішэнцаў" (з 16 619 да 20 365 чалавек). Скарачэнне перш за ўсё закранула катэгорыі "гандляры і пасрэднікі" (з 4677 да 1927 чалавек). Акрамя таго, са спісаў "лішэнцаў" былі выключаны адміністрацыйна высланыя асобы, якія раней (да высялення) улічваліся сельсаветамі па месцы жыхарства[8].

БССР лідзіравала па шэрагу паказчыкаў па "лішэнцах", дэманструючы свой радыкалізм у барацьбе з "класавымі ворагамі" і асаблівую (у параўнанні з іншымі саюзнымі рэспублікамі) "рэвалюцыйную пільнасць". Толькі ў БССР павялічыўся працэнт "лішэнцаў" у сельскай мясцовасці (па СССР і іншых 6 саюзных рэспубліках ён скараціўся: ад 0,1% да 2,0%). У сельскай мясцовасці БССР узрасла колькасць пазбаўленых выбарчага права па катэгорыі "выкарыстанне наёмнай працы з мэтай атрымання прыбытку" на 252%, у той час як у сярэднім па СССР на сяле прырост склаў 84%. Колькасць асоб, пазбаўленых выбарчага права як членаў сем'яў "лішэнцаў", у беларускай вёсцы павялічылася на 22,5%, а па СССР зменшылася на 19%. За пражыванне на непрацоўныя даходы ў гарадах БССР пазбавілі выбарчага права ў 1931 г. на 45% больш, чым у 1929 г., хоць па СССР гэты паказчык знізіўся на 50,4%[9].

Падбор кандыдатаў у члены нізавых Саветаў, як і раней, ажыццяўляўся мясцовымі партыйнымі арганізацыямі: частка кандыдатаў вылучалася непасрэдна партыйнымі органамі (у абавязковым парадку — плануемыя загадзя на наменклатурныя пасады старшыняў сельскіх і мястэчковых Саветаў), частка — на бядняцка-батрацкіх і калгасных сходах. Гэтая праца разглядалася ў якасці *"адной з формаў класавай барацьбы супраць імкненняў кулацка-нэпманаўскіх і варожых элементаў пралезці ў Саветы"*. У выніку такім чынам былі вылучаныя 34 526 кандыдатаў у Саветы, з якіх абраныя 29 317 (84,7%)[10].

Справаздачы і інфармацыя аб перавыбарчай кампаніі 1931 г. (як, зрэшты, і ўсіх папярэдніх падобных кампаній) насычаныя сцвярджэннямі аб *"надзвычайным абвастрэнні класавай барацьбы з боку кулацтва, шкоднікаў, бюракратаў, апартуністаў розных колераў", "шалёным супраціве кулакоў у вёсцы"*. Гаварылася пра выпадкі арганізацыі заможнымі сялянамі асобных сходаў (таемна або пад выглядам вечарынак), на якіх абмяркоўваліся свае кандыдатуры ў Саветы і рыхтаваліся выступы на выбарчых сходах. Аднак у якасці доказаў згадваліся толькі адзінкавыя выпадкі (пры папярэдніх перавыбарах такіх фактаў прыводзіліся значна больш). Як сведчанне *"надзвычайнага абвастрэння класавай барацьбы"* фігуравалі выступы сераднякоў супраць абрання ў склад сельсаветаў жанчын, асобныя выказванні ў падтрымку *"правых апартуністаў" ("Рыкава, які стаяў за сялян, з пасады старшыні СНК знялі, а памянялі Молатавым, які будзе больш ціснуць")* і г. д. Сцвярджалася аб пераходзе кулацтва да арганізаванага адкрытага тэрору супраць некаторых савецкіх актывістаў. Аднак ізноў жа прыводзіліся толькі адзінкавыя выпадкі, якія здарыліся ў перыяд справаздачна-перавыбарчай кампаніі, і, натуральна, усе яны адназначна ўладамі аднесеныя да спробаў зрыву гэтай кампаніі: забойства актывіста-калгасніка Гаркушы ў в. Барсукі (сельсавет і раён не пазначаны, а вёсак з такой назвай у БССР было не менш за дзясятак), напад на старшыняў Стрэлішчанскага сельсавета Бешанковіцкага раёна (быў цяжка паранены нажом) і Багушавіцкага сельсавета Бабруйскага раёна[11].

Як і ў пачатку 1930 г., найбольш распаўсюджанай праявай "шалёнага супраціву кулакоў" разглядаліся выступы на сходах супраць уключэння ў наказы дэпутатам пытання далейшай калектывізацыі вёскі. Такіх фактаў (не ў прыклад астатнім "праявам класавай барацьбы") прыводзілася значна больш. Натуральна, усе тыя, хто выступаў супраць гэтага наказу, абавязкова характарызаваліся як *"антысавецкі элемент, падкулачнікі"*.

У цэлым звесткі, якія змяшчаліся ў афіцыйных дакументах (справаздачы, даведкі, інфармацыя партыйных і савецкіх органаў аб ходзе і выніках справаздачна-выбарчай кампаніі, матэрыялы да XIV з'езда КП(б)Б і г. д.), не пацвярджаюць ні "шалёнага супраціву кулацтва", ні "надзвычайнага абвастрэння класавай барацьбы ў вёсцы". Аднак уладам патрабавалася даказаць, што такое было на самай справе, для чаго партыйна-савецкія органы ўсе выпадкі сумненняў ці нязгоды з курсам на фарсіраванае будаўніцтва сацыялізму ў горадзе і вёсцы, усе выпадкі выказвання незадаволенасці метадамі ажыццяўлення калектывізацыі (масавы гвалт, запалохванне, адміністрацыйны ціск і г. д.) без ваганняў адносілі да праяў класавай барацьбы, а іх носьбітаў — да ворагаў савецкай улады, кулакоў і іх "таемных агентаў".

Па афіцыйных дадзеных, яўка на перавыбары 1931 г. на сяле павялічылася на 7,5% *(гл. табл. 1)*.

*Табліца 1*

**Яўка на выбары ў БССР у 1929 і 1931 гг.** (%)[12]

| Катэгорыі выбаршчыкаў | | З'явіліся на выбары 1929 г. | З'явіліся на выбары 1931 г. |
|---|---|---|---|
| сяляне | | 57,8 | 65,7 |
| сярод сялян | калгаснікі | звестак няма | 78,5 |
| | аднаасобнікі | | 64,0 |
| сярод аднаасобнікаў | беднякі | звестак няма | 69,3 |
| | заможныя | | 61,4 |
| рабочыя | | 70,8 | 76,5 |
| служачыя | | 88,4 | 91,2 |

Натуральна, што самы высокі паказчык зафіксаваны ў катэгорыі калгаснікаў. Сярод аднаасобнікаў, якія складалі абсалютную большасць сялянскіх выбаршчыкаў (88,7%), прадказальна больш актыўнай была беднота. Такая сітуацыя цалкам зразумелая, бо практычна з самага пачатку існавання савецкай улады (за выключэннем кароткага перыяду 1925—1926 гг.) сельсаветы ўспрымаліся перш за ўсё як бядняцка-батрацкія органы ўлады, якія маюць класавы характар і прызначаныя для абароны інтарэсаў галоўным чынам "пралетарскай", найбяднейшай часткі сялянства. Серадняк на выбарах хоць і галасаваў за праўладных кандыдатаў, але на выбарчых сходах быў пасіўны.

Найменш актыўнымі былі зноў жа заможныя сяляне. З-за малой колькасці выбаршчыкаў гэтай катэгорыі (ўсяго 5,2% сялянскага электарату), адсутнасці легальнай магчымасці весці агітацыю і вылучаць сваіх кандыдатаў у члены Саветаў іх удзел у выбарах насіў фармальны характар.

У выніку перавыбараў доля калгаснікаў сярод членаў сельсаветаў значна перавысіла іх удзельную вагу сярод сялянства (14,7%) *(гл. табл. 2)*. Пры гэтым доля калгаснікаў павышалася па меры ўзрастання функцыянальных абавязкаў і адміністрацыйных магчымасцяў сельсаветаўскіх структур: члены — члены прэзідыумаў — старшыні сельсаветаў.

*Табліца 2*

**Склад сельсаветаў БССР 1931 г.** (%)[13]

| Катэгорыі выбаршчыкаў | | Члены | Члены прэзідыумаў | Старшыні |
|---|---|---|---|---|
| сяляне | | 90,2 | 80,5 | 74,4 |
| сярод сялян | калгаснікі | 24,7 | 53,5 | 69,7 |
| | аднаасобнікі | 73,5 | 46,5 | 30,3 |
| сярод аднаасобнікаў | беднякі | 53,7 | 63,1 | 66,9 |
| | заможныя | 0,6 | 0,9 | — |
| рабочыя | | 5,3 | 11,5 | 18,1 |
| служачыя | | 3,9 | 7,1 | 7,3 |

Працягвалася пачатая з канца 1920-х гг. мэтанакіраваная палітыка па забеспячэнні прысутнасці ў складзе сельсаветаў "пралетарскіх" слаёў сельскага насельніцтва — беднякоў, парабкаў і сельскагаспадарчых рабочых. Сярод аднаасобнікаў больш за палову месцаў у сельсаветах атрымалі беднякі, двое з трох старшыняў сельсавета, выбраных з аднаасобнікаў, таксама былі беднякамі. Серадкякі працягвалі губляць свае лідзіруючыя пазіцыі, заваяваныя ў 1925—1926 гг.

Прыкметна (на 11,8%) з 1929 г. вырасла доля рабочых сярод старшыняў сельсаветаў, што з'явілася следствам актыўнай кампаніі па накіраванні фабрычна-завадскіх рабочых на працу ў вёску старшынямі сельсаветаў, што праводзілася з пачатку 1930 г.

Склад раённых з'ездаў Саветаў і іх выканкамаў не адпавядаў сацыяльнай структуры беларускага грамадства, але адпавядаў інтарэсам уладаў *(гл. табл. 3)*.

*Табліца 3*

**Склад раённых з'ездаў Саветаў і іх выканкамаў** (%)[14]

| Катэгоры выбаршчыкаў | З'езды | | Саветы | | Старшыні | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1929 | 1931 | 1929 | 1932 | 1929 | 1931 |
| сяляне | 64,2 | 53,0 | 51,3 | 31,3 | — | — |
| сярод іх калгаснікаў | — | 58,5 | 72,5 | — | — | — |
| рабочыя | 17,0 | 21,8 | 24,7 | 32,6 | 36,7 | 26,6 |
| у тым ліку на адм.-гасп. рабоце | — | 9,0 | — | 22,0 | — | 24,5 |
| служачыя | 14,9 | 21,0 | 19,7 | 32,2 | 25,5 | 73,4 |
| члены КП(б)Б | 44,1 | 50,8 | 57,4 | 67,8 | 100 | 100 |
| абраныя першы раз | 46,4 | 42,1 | 69,3 | 47,1 | 32,2 | 13,8 |

Сярод дэлегатаў раённых з'ездаў значна (на 11,2%) скарацілася доля сялян, абсалютную большасць з якіх склалі калгаснікі. Узрасла доля рабочых, служачых, членаў бальшавіцкай партыі.

Гэта дазваляла сфарміраваць неабходны ўладам склад райвыканкамаў. Сярод іх старшыняў не аказалася ніводнага селяніна, тыя, хто паходзіў з рабочых, практычна ўсе ўжо працавалі раней на гэтай пасадзе. А абсалютную большасць старшыняў склалі служачыя. Традыцыйна ўсе старшыні райвыканкамаў былі камуністамі. Такім чынам, сярэднестатыстычны старшыня беларускага райвыканкама — гэта мужчына ва ўзросце ад 30 да 39 гадоў, камуніст, служачы, які ўжо раней займаў гэтую пасаду.

Сярод старшыняў гарсаветаў абсалютную большасць атрымалі рабочыя — 69,0%. Аднак яны ў асноўным таксама ўжо займалі розныя адміністрацыйныя і гаспадарчыя кіруючыя пасады да выбараў (58,6%). Уласна рабочыя ("рабочыя ад станка") склалі толькі 10,4%. Сярод старшыняў гарсаветаў значна ўзрасла праслойка служачых — з 16,7% у 1929 г. да 27,6% у 1931 г. Як і раней, усе старшыні гарсаветаў, як наменклатурныя работнікі, былі камуністамі. Большая частка старшыняў гарсаветаў (75,9%) ужо да перавыбараў працавалі на гэтай пасадзе[15]. Сярэднестатыстычны старшыня гарсавета — мужчына ад 30 да 39 гадоў, камуніст з пачатковай адукацыяй, з рабочых, які меў вопыт работы на гэтай (альбо іншай кіруючай) пасадзе.

У выніку перавыбарчай кампаніі 1931 г. у БССР быў замацаваны працэс ператварэння сельсаветаў у органы "дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы", дасягнуты яшчэ ў ходзе папярэдніх перавыбараў 1929 і 1930 гг. Адкрыты супраціў сялянства масавай фарсіраванай калектывізацыі быў пераадолены, з лета 1932 г. прымяненне найбольш відавочных грубых формаў яе ажыццяўлення абмежавалася чарговай актывізацыяй кампаніі па "барацьбе з парушэннямі сацыялістычнай законнасці". Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 25 чэрвеня 1932 г. "Аб рэвалюцыйнай законнасці" прызнавалася наяўнасць *"значнай колькасці па-*

*рушэнняў рэвалюцыйнай законнасці з боку службовых асоб і скрыўленняў у практыцы яе правядзення, асабліва ў вёсцы".* Урады саюзных і аўтаномных рэспублік і органы пракуратуры абавязваліся правесці праверку заяў аб фактах парушэнняў рэвалюцыйнай законнасці з боку службовых асоб і забяспечыць больш хуткі разгляд спраў аб гэтых парушэннях і накладанне мер спагнання ажно да аддання пад суд у дачыненні да службовых асоб, якія дапусцілі гэтыя парушэнні. Асабліва падкрэслівалася неабходнасць праверкі практыкі накладання штрафаў райвыканкамамі і сельсаветамі (перш за ўсё ў сувязі з праведзенымі сельскагаспадарчымі кампаніямі), прадпісвалася ў самыя кароткія тэрміны адмяніць і зняць адміністрацыйныя штрафы і спагнанні, накладзеныя ў парушэнне агульнасаюзнага і рэспубліканскага заканадаўства. Было загадана ліквідаваць факты накладання цвёрдых заданняў аб раскулачванні ў дачыненні да калгаснікаў і серадлякоў-аднаасобнікаў[16]. Адпаведна ў БССР у 1932—1933 гг. была праведзена серыя судовых працэсаў (у тым ліку паказальных) па фактах незаконнай канфіскацыі маёмасці, яе прысваення, арыштаў і збіванняў аднаасобнікаў і калгаснікаў старшынямі і членамі сельсаветаў.

Чарговыя перавыбары мясцовых Саветаў праходзілі ў лістападзе — снежні 1934 г. у іншых умовах. У звароце ЦВК СССР да выбараў у Саветы ад 27 верасня 1934 г. новая выбарчая кампанія атрымлівала іншае, чым раней, гучанне: замест *"формы праявы класавай барацьбы"* яна стала разглядацца як *"найшырэйшы агляд перамог сацыялістычнага будаўніцтва"*. Вынікі масавай калектывізацыі, ліквідацыя магчымых апанентаў улады сярод сялянства ў выніку палітыкі *"ліквідацыі кулацтва як класа"*, адпрацаваная многімі гадамі сістэма арганізацыі і правядзення перавыбарчай кампаніі ўжо не выклікалі ў партыйна-савецкіх уладаў сумневаў і трывогі з нагоды яе вынікаў. Выбары канчаткова страцілі сваё асноўнае значэнне як арэна барацьбы за ўладу, спосаб змены кіруючых элітаў і рэалізацыя прадстаўніцтва разнастайных інтарэсаў насельніцтва. Іх неабходна было напоўніць зразумелым для мясцовай улады і насельніцтва новым зместам, надаць ім пэўны сэнс. У выніку выбары пераўтвараліся ў адну з *"палітыка-гаспадарчых кампаній"*, у сродак *"арганізацыі мільённых мас працоўных, калгаснікаў і савецкай інтэлігенцыі на далейшую барацьбу за пабудову сацыялізму і ўмацаванне Саветаў — органаў пралетарскай дыктатуры"*. У звароце захоўваліся пасажы пра неабходнасць *"своечасова выкрываць і спыняць задумы і падрыўную работу ворагаў працоўных"*, але яны ўжо відавочна адыходзілі на задні план і хутчэй служылі сродкам захавання мабілізацыйнага стану мясцовых партыйных і савецкіх органаў у перавыбарчай кампаніі, чым актуальнай іх задачай. Практычна ўвесь тэкст звароту складаўся з канстатацыі перамог сацыялізму ў эканоміцы і культуры, поспехаў у правядзенні індустрыялізацыі і калектывізацыі, пераказванні задач, пастаўленых XVII з'ездам УсеКП(б)[17].

2 кастрычніка 1934 г. ЦВК СССР зацвердзіў новую інструкцыю аб выбарах у Саветы 1934 г.[18]. Асноўныя адрозненні ад папярэдняй заключаліся, па-першае, у карэкціроўцы катэгорый "лішэнцаў". Зніклі катэгорыі "лішэнцаў" па прыкмеце вядзення прадпрымальніцкай гаспадаркі *("мелі або здавалі ў арэнду прамысловыя і прамысловыя прадпрыемствы з механічным рухавіком або якія выкарыстоўвалі на іх пастаянную або сезонную наёмную працу")* у сувязі з ліквідацыяй такіх. Але дадаткова з'явілася новая катэгорыя *"лішэнцаў"*: кулакі, выселеныя за межы вёсак і пасёлкаў, у якіх яны раней пражывалі, за супрацьсавецкія і супрацькалгасныя выступы. Па-другое, уключаўся пункт аб парадку аднаўлення ў выбарчых правах дзяцей высланых кулакоў, якія знаходзіліся ў спецпасёлках і месцах ссылкі, а таксама кулакоў, выселеных за межы вёсак і пасёлкаў. Па-трэцяе, падымалася планка мінімальна дапушчальнай яўкі на выбары — з 40 да 50%.

Адпаведна гэтыя ўказанні былі прынятыя для выканання і ў БССР. Рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 3 кастычніка 1934 г. працягвалася лінія на кватаванне месцаў за жанчынамі (трацiна ўсіх абраных дэпутатаў) і беспартыйнымі (не менш за 35—40% сярод дэлегатаў раённых з'ездаў і IX Усебеларускага з'езда Саветаў; не менш за 30—40% у складзе пленумаў гарсаветаў і 25—30% у складзе пленумаў райвыканкамаў)[19]. Апошняе павінна было пацвердзіць наяўнасць "непарушнага блока камуністаў і беспартыйных" — пры адсутнасці такога кватавання, хутчэй за ўсё, дэпутатамі партыйныя ўлады вызначылі б толькі камуністаў, чые паводзіны былі больш прадказальныя і падкантрольныя.

Райкамам і гаркамам партыі даручалася ствараць праекты наказаў дэпутатам у Саветы, улічваючы мясцовыя ўмовы. Іх прапаноўвалася ад імя райкамаў і гарсаветаў апублікаваць да пачатку перавыбарчай кампаніі. Вызначаўся пайменны склад Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВыбК) пад старшынствам М.А.Ляўкова*, колькасны склад гарадскіх і раённых выбарчых камісій на чале са старшынямі гарсаветаў і райвыканкамаў.

ЦВК БССР у фармальным савецкім парадку ўсе гэтыя рашэнні аформіў 3 кастрычніка 1934 г. Яго прэзідыум зацвердзіў інструкцыю аб выбарах у Саветы БССР. Парог яўкі на выбарчыя сходы для сельскай мясцовасці ўсталёўваўся ў 50%, для гарадоў — у 60%[20].

---

* Ляўкоў Максім Архіпавіч (1894—1937) — беларус, ураджэнец вёскі Кавалі Бабрускага павета. Удзельнік Першай сусветнай вайны. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады грамадзянскай вайны, член КП(б)Б з 1918 г. З 1920 г. — ваенны камісар Бабруйскага павета, старшыня Замошскага валвыканкама. З 1929 г. на працы ў ЦК КП(б)Б. З 1931 г. — наркам юстыцыі і пракурор БССР. З 1933 г. — сакратар ЦВК БССР. Член ЦК КП(б)Б і яго прэзідыума ў 1929—1932 гг. Арыштаваны і расстраляны ў кастрычніку 1937 г. як "агент польскай разведкі і член нацыянал-фашысцкай арганізацыі". Рэабілітаваны 21 верасня 1957 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР.

У пачатку кастрычніка 1934 г. аргаддзелам Прэзідыума ЦВК БССР быў падрыхтаваны і разасланы на месцы падрабязны "Прыкладны план арганізацыйнай работы сельскай выбарчай камісіі па падрыхтоўцы і правядзенні справаздачна-перавыбарчай кампаніі Саветаў"[21]. У ім утрымліваўся пералік і тэрміны правядзення мерапрыемстваў па арганізацыі перавыбарчай кампаніі: скліканне пашыраных пленумаў сельсаветаў сумесна з актывам, праверка рэвізійнымі камісіямі фінансавага становішча сельсаветаў, складанне спісаў пазбаўленых выбарчага права, вызначэнне выбарчых участкаў, афармленне памяшканняў для выбарчых сходаў, арганізацыя ясляў і дзіцячых пляцовак на час справаздачных і перавыбарчых сходаў, правядзенне перадвыбарчых нарад і г. д.

Перавыбары 1934 г. усё больш прымалі форму новага ўсенароднага свята — свята ўрачыстасці сацыялізму. На месцах распрацоўваліся масавыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да перавыбараў. Так, Гомельскім гаркамам партыі планавалася правядзенне сходу маладых выбаршчыкаў, якія ўпершыню ўдзельнічалі ў перавыбарах, арганізацыя ва ўсіх кінатэатрах выступленняў агітатараў, правядзенне гутарак ва ўсіх школах, тэхнікумах, ВНУ і піянерскіх атрадах, інфармаванне па радыё кожны дзень па 10—15 хвілін аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў, упрыгожванне цэнтральнай плошчы імя У.І.Леніна, вітрын магазінаў, фасадаў будынкаў на дзвюх цэнтральных вуліцах, будынкаў усіх кінатэатраў, клубаў (звонку і ўнутры), аўтобусаў заклікамі і плакатамі перавыбарчай тэматыкі, мастацкае афармленне Дома гарсавета і г. д.[22]

У кастрычніку 1934 г. Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову "Аб вытворчым паходзе імя XI Усебеларускага і VII Усесаюзнага з'ездаў Саветаў". Ставілася задача ўключыць усе раёны, Саветы, прадпрыемствы, саўгасы і калгасы ў гэты вытворчы паход, прысвечаны перавыбарчай кампаніі ў Саветы 1934 г. Яго мэтай абвяшчалася дасягненне поўнага выканання і перавыканання "прамфінпланаў" прадпрыемстваў, сельгаспаставак, падрыхтоўка жывёлы да зімоўкі, арганізацыя культурнага добраўпарадкавання гарадоў і вёсак. Асобна вылучалася задача работы сярод аднаасобнікаў з мэтай, па-першае, поўнага выканання імі абавязковых дзяржпаставак, па-другое, масавага іх уключэння ў калгасы. Было вырашана стварыць "Чырвоную кнігу імя XI з'езда Саветаў БССР", куды заносіць перадавыя прадпрыемствы, саўгасы і калгасы, райсаветы і асобных выдатных перадавікоў вытворчасці[23].

Ужо 10 кастрычніка 1934 г. інфармацыйны бюлетэнь аргаддзелу ЦВК БССР паведамляў аб першых поспехах "вытворчага паходу" — прыняцці павышаных гаспадарчых планаў на 1934 г. Прамысловыя прадпрыемствы бралі абавязацельствы датэрмінова выканаць гадавы план 1934 г., выпусціць звышпланавую прадукцыю, выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва іншыя (у тым ліку і расійскія) прадпрыемствы. Адначасова прымаліся абавязацельствы па паляпшэнні бытавых умоў працоўных: добраўпарадкаванне двароў, масавыя пасадкі дрэў, рамонт інтэрнатаў і кватэр рабочых, выдзяленне рабочым грошай і будматэрыялаў для рамонту кватэр, пабудова склепаў, шкленне кватэр, выдача парсючкоў для вырошчвання і г. д. Старшыні калгасаў і сельсаветаў абяцалі павысіць ураджай у наступным годзе, датэрмінова выканаць план здачы бульбы дзяржаве, арганізаваць новыя калгасы.

Першапачаткова такія прыклады былі адзінкавымі. Большасць мясцовых кіраўнікоў на падобны "вытворчы паход" альбо наогул не звярнулі ўвагі, альбо займаліся "ашуканствам". Аргаддзел ЦВК БССР паведамляў, што многія старшыні райвыканкамаў рапартавалі, што *"праведзены мітынгі па ўсіх сельсаветах, прадпрыемствах, якія ўключыліся ў паход, між тым праверка выявіла, што па шэрагу прадпрыемстваў... практычна нічога не зроблена... нават дэпутаты гэтых прадпрыемстваў заявілі, што ніякіх мітынгаў у іх не было і ў вытворчы паход яны яшчэ не ўключыліся"*[24].

Да моманту саміх выбараў колькасць удзельнікаў гэтага "паходу" павялічылася да 350 прадпрыемстваў. Вытворча-фінансавы план 1934 г. датэрмінова выканалі каля 150 прадпрыемстваў БССР. Да канца года дзевяць прамысловых гарадоў БССР упершыню поўнасцю выканалі гадавы "прамфінплан". Восем перадавых прадпрыемстваў былі занесеныя ў "Чырвоную кнігу імя XI з'езда Саветаў БССР". У сельскай гаспадарцы як вынікі такога "паходу" ўлады адзначалі паспяховае выкананне гаспадарчых кампаній: уборка збожжавых у 1934 г. закончылася на 50 дзён раней, чым у 1933 г., пасяўная яравых — на 20 дзён. Хлебапастаўкі выканалі на чатыры месяцы раней, як у 1933 г.[25].

Першыя звесткі аб ходзе выбараў ізноў выявілі парушэнні выбарчага заканадаўства: выбары пры адсутнасці неабходнага працэнта выбаршчыкаў, галасаванне спісам за кандыдатаў, прыняцце наказаў пры галасаванні за іх меншасцю выбаршчыкаў і інш. Рашэннем беларускай ЦВыбК за такія парушэнні былі распушчаны баркалабаўская (Быхаўскі раён), прудкоўская (Мазырскі раён), кармянская (Кармянскі раён), церахоўская (Церахоўскі раён) і некаторыя іншыя мясцовыя выбарчыя камісіі, адмененыя вынікі перавыбараў у двух сельсаветах Заслаўскага і адным Церахоўскага раёнаў. За *"правал падрыхтоўчай работы"* быў адхілены ад працы старшыня Аршанскай пасялковай выбарчай камісіі[26].

У выніку невыканання дырэктыўных партыйных указанняў па арганізацыі выбарчай кампаніі прымаліся рашэнні аб правядзенні паўторных выбараў. У прыватнасці, з-за нізкай яўкі выбаршчыкаў і малой колькасці абраных у сельсаветы жанчын па Рагачоўскім раёне пастановай ЦВыбК адменены выбары цалкам і праведзены новыя ў 7 Саветах, па Чачэрскім — у 3, па Старадарожскім і Заслаўскім — у 2 і г. д. Выбары па Яноўскім сельсавеце Асіповіцкага раёна адмяняліся два разы, паколькі і пры паўторных выбарах у склад сельсавета была абраная толькі адна жанчына[27].

Ідыёма *"абвастрэнне класавай барацьбы"* на выбарах 1934 г. была скарэктавана як *"супраціў з боку рэшткаў разгромленага кулацтва, чужых, класавеварожых элементаў"*. Да фактаў адкрытага выступу "класавага ворага" адносіліся *"супраціў здачы абавязковых паставак, агітацыя супраць савецкай улады і тэрарыстычныя акты супраць актывістаў сельсаветаў"*. *"Супраціў здачы абавязковых паставак"* выяўляўся ў заявах рахункаводаў двух калгасаў аб неабходнасці скарачэння планаў нарыхтовак хлеба дзяржаве. *"Агітацыя супраць савецкай улады"* пацвярджалася адзінкавымі выпадкамі распаўсюджвання чутак пра абавязковае ўнясенне платы за ўдзел у перавыбарах і заявай аднаго калгасніка: *"Мне ўсё роўна, якая ўлада — польская, савецкая або жыдоўская"*.

Незадаволенасць сялян палітыкай калектывізацыі, узмацненнем падатковага ціску на аднаасобнікаў ва ўмовах адсутнасці легальнай магчымасці процідзеяння прывяло да росту гвалту з боку сялянства. Так, у ходзе перавыбарчай кампаніі ў Быхаўскім раёне былі забітыя рахункавод калгаса "Асветнік" Путчынскага сельсавета, актывіст-калгаснік калгаса "Чырвоны баец" Нова-Быхаўскага сельсавета, збітыя два старшыні сельсаветаў, а таксама прадстаўнік райкама партыі на сходзе моладзі па пытаннях перавыбараў у Грузінаўскім сельсавеце (нагода — *"адмовіўся выпіць самагону з мясцовымі жыхарамі"*). Падчас пасяджэння Іскаўскага сельсавета Дубравінскага раёна быў паранены яго старшыня Гарбачоў. У Магілёўскім раёне адзін актывіст быў забіты, паранены сельскі карэспандэнт[28]. А найбольш распаўсюджанай формай антысавецкай барацьбы ў перыяд перавыбарчай кампаніі сталі падпалы дамоў савецкіх актывістаў і зрыў справаздачных сходаў.

Агульная яўка выбаршчыкаў у БССР у 1934 г. дасягнула 83,94% (у тым ліку ў вёсцы — 81,98%). У шэрагу раёнаў атрымалася блізка падысці да выканання задачы "пагалоўнага" ўключэння ў выбары: у Мінскім, Сенненскім, Прапойскім, Аршанскім, Гомельскім, Крычаўскім і шэрагу іншых раёнаў яўка склала 89—92%. А вось яўка на ўзроўні 71—75% ужо кваліфікавалася сакратаром ЦВыбК БССР М.А.Ляўковым як *"недапушчальна нізкі працэнт"*[29].

Па выніках выбараў кіраўніцтва БССР заяўляла, што калгаснік стаў цэнтральнай фігурай сельсавета. Фармальна так і адбылося: тры з чатырох членаў сельсаветаў былі калгаснікамі, што ўжо адпавядала ўдзельнай вазе калгаснікаў сярод сельскага насельніцтва. Аднак вырашальная роля ў працы сельсаветаў традыцыйна належала іх старшыням, якія часцей за ўсё ў адзіночку вырашалі пытанні. А сярод старшыняў сельсаветаў калгаснікаў аказалася менш, чым служачых (37,5% супраць 48,4%), якія фармальна і сталі "цэнтральнай фігурай сельсавета". Разам з тым гэта зусім не азначае, што старшынямі сельсаветаў у масе сваёй сталі сельскія інтэлігенты (лекары, настаўнікі, аграномы, заатэхнікі). Старшыня сельсавета лічыўся дзяржаўным чыноўнікам і ў выпадку яго паўторнага пераабрання (пры ўмове працы на гэтай пасадзе не менш за 2 гады) ішоў па катэгорыі "служачы". Таму і сярод старшыняў калгаснік застаўся "цэнтральнай фігурай", што назіралася яшчэ ў выніку выбараў 1931 г.

Аднаасобнікі цалкам страцілі свае пазіцыі: сярод членаў сельсаветаў іх аказалася толькі 9,9%, а сярод старшынь — наогул ніводнага. Выканаць заданне па "жаночай квоце" не атрымалася: замест запланаваных 33% жанчын у сельсаветах было 26,8%. У гарсаветах 50% склалі рабочыя, служачыя — 23,4%, каля паловы — члены альбо кандыдаты ў члены КП(б)Б. Усе старшыні гарсаветаў былі камуністамі[30].

Выбары дэлегатаў на раённыя з'езды, дзе фармаваўся *склад органаў раённай дзяржаўнай улады*, а таксама дэпутатаў на Усебеларускі з'езд Саветаў, мелі фармальнае значэнне. З'езды ніякіх нечаканасцяў для ўладаў не прынеслі, склад райвыканкамаў і іх старшыняў быў традыцыйна ўжо загадзя вызначаны партыйнымі інстанцыямі. Асноўная частка пасад раённага кіраўніцтва адносілася да наменклатурных, прызначэнне і зняцце з якіх вызначалася рашэннямі партыйных органаў адпаведнага ўзроўню. У сярэдзіне 1930-х гг. да наменклатуры ЦК КП(б)Б адносіліся старшыні, загадчыкі зямельнымі і фінансавымі аддзеламі усіх райвыканкамаў, Мінскага, Гомельскага, Віцебскага гарсаветаў, эканамісты раённых планавых частак, раённыя інспектары народнай адукацыі, працы і сацыяльнага страхавання прыгранічных раёнаў і 7 найбольш буйных гарадоў (Віцебска, Магілёва, Мазыра, Рэчыцы, Барысава, Бабруйска, Менска), аховы здароўя, кіруючыя работнікі гарадской і раённай міліцыі. Тыпавая структура размеркавальнай наменклатуры райкамаў КП(б)Б уключала старшыняў, загадчыкаў агульнымі аддзеламі, сакратароў райвыканкамаў і гарсаветаў, інспектараў асветы, працы, забеспячэння, аховы здароўя, дырэктараў камбінатаў мясцовай прамысловасці, раённых планавікоў, старшыняў сельсаветаў. Практычна ўвесь склад (у тым ліку і выбарны) раённай вертыкалі ўлады фармаваўся наменклатурным спосабам, а раённыя з'езды толькі фармалізавалі партыйныя рашэнні ў савецкім парадку.

Такім чынам, афіцыйная ідэалогія перавыбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы ў першай палове 1930-х гг. была скарэктаваная ў адпаведнасці з новымі ўладнымі палітыка-эканамічнымі прыярытэтамі. Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) (студзень 1933 г.) зафіксаваў вырашэнне пытання "хто-каго" на *"карысць сацыялізму супраць капіталістычных элементаў горада і вёскі"*. XVII з'езд УсеКП(б) (студзень — люты 1934 г.) у сваю чаргу абвясціў пабудову падмурка сацыялізму і *"разгром апошняга капіталістычнага класа — кулацтва"*, вызначыўшы ў якасці асноўнай задачы новага этапу развіцця савецкага грамадства *"завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі"*[31]. У такіх умовах мабілізацыйны патэнцыял лозунга "абвастрэння класавай барацьбы" губляў сваё першараднае значэнне. Патра-

бавалася іншая ідэя, зразумелая большасці людзей і здольная максімальна выкарыстоўваць чалавечы патэнцыял у новых умовах. Гэтая ідэя вырасла і ўзмацнілася ў гады першай пяцігодкі: масавы працоўны запал, які хутка ператвараўся ў адзін з выращальных сродкаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Адпаведна з гэтымі новымі рэаліямі і ўладнымі прыярытэтамі патрабавалася перабудаваць і працу па арганізацыі і правядзенні перавыбарчых кампаній у Саветы. Арыентацыя на выбары як форму праявы "жорсткай класавай барацьбы" змянілася імкненнем выкарыстоўваць іх у якасці аднаго з галоўных сродкаў мабілізацыі насельніцтва ў рэканструктыўны перыяд. Перавыбары 1934 г. сталі першым вопытам шырокага прымянення перавыбараў у Саветы у якасці сродку вырашэння тэхніка-эканамічных задач. Вядома, гэта зусім не азначала адмову ад працягу палітыкі класавай барацьбы, скарэктаванай мэтай якой стала *"канчатковае знішчэньне капіталістычных элементаў і класаў наогул"*. Аднак класавы матыў ужо не дамінаваў у выбарнай агітацыйна-прапагандысцкай рабоце, а выступаў у якасці толькі дадатковага інструмента. Усе наступныя выбары толькі ўзмацнялі ў іх гэтую вытворча-гаспадарчую дамінанту.

Паўтараючыся рэгулярна, выбарчыя кампаніі ў значнай ступені садзейнічалі інтэрыярызацыі асобы савецкага чалавека, ператварэння знешняй сацыяльнай практыкі, знешніх стандартаў і стэрэатыпаў паводзін, звязаных з удзелам у выбарах, у яго ўстойлівыя ўнутраныя ўстаноўкі ў паводзінах. На першы погляд рытуальнае па сваёй знешняй форме дзеянне (удзел у перадвыбарчых сходах, яўка на выбарчы ўчастак, апусканне выбарчых бюлетэняў у скрыню) з часам набывае выгляд значнага ўзору паводзін, што, у сваю чаргу, служыла важным элементам стабільнасці ўсёй сацыяльнай сістэмы.

У выніку выбараў быў сфарміраваны неабходны ўладам склад мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных усіх узроўняў, дасягнута дамінаванне ў іх прадстаўнікоў партыйна-савецкага наменклатурнага апарату. Пры гэтым за кошт складу нізавых (сельскіх і гарадскіх) Саветаў у чарговы раз у мэтах прапаганды пераваг савецкай сістэмы ўдалося пацвердзіць асноватворны бальшавіцкі тэзіс аб савецкай уладзе як "сапраўды народнай, рабоча-сялянскай".

[1] Елізараў С.А. "Вялікі пералом" і перавыбары Саветаў БССР 1930 года // Беларускі гістарычны часопіс. 2017. № 4. С. 29—34.

[2] Собрание законов и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Союза Советских Социалистических Республик (далей — СЗ СССР). 1930. № 50. С. 524; Збор законаў і распараджэнняў рабоча-сялянскага ўрада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (далей — БССР). 1930. Аддз. 1. № 42. С. 275.

[3] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (далей — ДАГАГВ). Ф. 265, воп. 4а, спр. 166, арк. 152.

[4] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4п, воп. 1, спр. 4765, арк. 12 — 12адв.

[5] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 2837, арк. 114.

[6] Выборы в Советы и состав органов власти в СССР в 1931 г. Москва, 1931. С. 11.

[7] Масавая работа Саветаў БССР (па матэрыялах месц і інструктарскіх абследаваньняў работы саветаў). Менск, 1931. С. 3.

[8] Выборы в Советы... С. 8-9.

[9] Падлічана аўтарам паводле выдання: Выборы в Советы... С. 8-9, 36.

[10] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 2837, арк. 114-115.

[11] Масавая работа Саветаў БССР... С. 5; НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 4756, арк. 273—275; Ф. 6, воп. 1, спр. 2837, арк. 130-131.

[12] Выборы в Советы... С. 2-3.

[13] Там жа. С. 10—15.

[14] Там жа. С. 22—24.

[15] Там жа. С. 20.

[16] СЗ СССР. 1932. № 50. Отд.1. Пост. 298.

[17] Обращение Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР о выборах в советы в 1934—1935 гг.// Электронны рэсурс: http://istmat.info/node/41915. Дата доступу: 16.12.2016.

[18] СЗ СССР. Отд. 1. 1934. № 50. С. 394.

[19] ДАГАГВ. Ф. 265, воп. 4а, спр. 197, арк. 124-125.

[20] СЗ БССР. 1934. № 39. С. 194-195; СЗ БССР. 1934. №39. С. 196а-196б.

[21] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (далей — ДАГВ). Ф. 208, воп. 1, спр. 1050, арк. 18—20.

[22] ДАГАГВ. Ф. 265, воп. 1, спр. 226, арк. 4—6.

[23] ДАГВ. Ф. 208, воп. 1, спр. 1050, арк. 110-111.

[24] Там жа. Арк. 3—8.

[25] Бальшавік Беларусі. 1934. № 22-23. С. 18-19.

[26] ДАГАГВ. Ф. 208, воп. 1, спр. 1050, арк. 65; Ф. 265, воп. 4а, спр. 190, арк. 225, 228.

[27] Бальшавік Беларусі. 1934. № 22-23. С. 22.

[28] ДАГВ. Ф. 208, воп. 1, спр. 1050, арк. 30, 41-42.

[29] Ляўкоў М.А. Папярэднія вынікі выбараў у Саветы // Бальшавік Беларусі. 1934. № 22-23. С. 21.

[30] Итоги выборов в местные Советы депутатов трудящихся 1939 г. Москва, 1941. С. 24, 56.

[31] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898—1986): в 15 т. 9-е изд., испр. и доп. Т. 5. Москва, 1983—1989. 1984. С. 72, 129—131.